*Краязнаўчыя чытанні*

# Цэнтры асветы і духоўнасці

Гарадзеншчына і Навагрудчына здаўна былі найбуйнымі і значнымі цэнтрамі развіцця бібліятэчнай справы на землях Беларусі. Бібліятэчная справа на Гродзеншчыне налічвае дзевяць стагоддзяў. З'яўленне першых бібліятэк у нашым краі звязанае з узнікненнем пісьменства і распаўсюджваннем рукапісных кніг. У гэты час дамінавальную ролю мелі манастырскія бібліятэкі. Найбуйнейшай сярод іх была бібліятэка Лаўрышаўскага Багародзіцкага манастыра на Навагрудчыне. Ад гэтай значнай бібліятэкі засталося толькі «Лаўрышаўскае Евангелле» XIV стагоддзя, якое захоўваецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве. Манастырскія бібліятэкі ўяўлялі сабой не толькі кнігазборы ды майстэрні па перапісванні кніг, але і цэнтры распаўсюджвання пісьменства сярод насельніцтва.

Са з'яўленнем у канцы XVI стагоддзя на Гарадзеншчыне каталіцкага касцёла і кляштараў з'яўляюцца бібліятэкі іншага зместу. Праз кляштарныя бібліятэкі на краі распаўсюджваецца еўрапейская кніга, у тым ліку і свецкая. Практычна ва ўсіх буйных гарадах дзейнічалі кляштарныя бібліятэкі. Найбуйнейшая з іх, бібліятэка Гарадзенскага дамініканскага кляштара, мела звыш 10 000 тамоў інкунабулаў і рэдкіх выданняў.

Таму нядзіўна, што мэта Другіх Шчорсаўскіх чытанняў – асэнсаваць значэнне і вартасць гістарычных кнігазбораў Гродзеншчыны і Навагрудчыны, выявіць асаблівасці іх фармавання, захавання і даследавання ў кантэксце кніжнай культуры і, несумненна, ушанаванне найбагацейшай бібліятэкі Лаўрышаўскага манастыра.

Другія Шчорсаўскія навуковыя чытанні прысвячаліся тэме «Развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне: манастырскія і царкоўныя кнігазборы». Арганізавалі навуковую сустрэчу Навагрудская цэнтральная раённая бібліятэка, Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага і Навагрудскі раённы выканаўчы камітэт. У знакамітае гістарычнае мястэчка Шчорсы з'ехаліся навукоўцы, краязнаўцы, святары, супрацоўнікі бібліятэк і музеяў дзеля асэнсавання значэння і лёсу царкоўных і манастырскіх бібліятэк Навагрудчыны і Гарадзеншчыны, гісторыі і развіцця праваслаўных, уніяцкіх, каталіцкіх цэнтраў пісьменства і кнігадрукавання гарадзенскага рэгіёну.

З прывітальнымі словамі звярнуліся намеснік старшыні Навагрудскага райвыканкама Святлана Каралько, дырэктар абласной бібліятэкі Лідзія Мальцава і старшыня Шчорсаўскага сельскага Савета Генрых Лукоўскі. У дакладах глыбока і грунтоўна была раскрытая кніжная спадчына Гарадзеншчыны, перспектывы яе выяўлення, захавання і папулярызацыі; лёс бібліятэк канфесійных установаў Гродзеншчыны, Навагрудскага езуіцкага калегіума і дамініканскага кляштара; гісторыя і змест выданняў найбуйных выдавецкіх канфесійных цэнтраў нашага краю, выкарыстанне царкоўных і манастырскіх дакументаў для вывучэння мінуўшчыны Гарадзеншчыны, унёсак знакамітых уніяцкіх і каталіцкіх святароў у нацыянальна-асветніцкую дзейнасць у родным краі.

Пад час чытанняў працавал кніжныя выстаўкі «Таямніца духоўнай кнігі – таямніца святасці», «Мудрае святло на карысць чалавецтва», фотавернісаж «Шчорсы ў рэтрааб'ектыве». На першай кніжнай выстаўцы былі прадстаўленыя старадрукі і рэдкія выданні з Лаўрышаўскага і Жыровіцкага манастыроў. Другая змяшчала сучасныя рэлігійныя выданні, дакументы па гісторыі царквы і культавай архітэктуры з фондаў Навагрудскай цэнтральнай бібліятэкі. Сапраўдным аздабленнем яе сталі карціны мясцовага мастака Яўгена Даўлюды з выявамі храмаў Навагрудка.

У межах чытанняў была арганізаваная экскурсія ў Лаўрышаўскі Свята-Елісееўскі манастыр.

Уражанні ўдзельнікаў і гасцей чытанняў толькі станоўчыя і ўзвышаныя. І гэта нядзіўна, бо Шчорсаўскі край з'яўляецца асяродкам велічнай і багатай гісторыі.



*Выступае Святлана Марозава, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта*

*Любоў ТУРМАСАВА,*
*загадчык аддзела краязнаўства*
*Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі*
*імя Я.Ф. Карскага*

*Фота аўтара*